ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дырэктар Дзяржаўнай
установы адукацыі
«Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У. І. Слабодчыкава»
____________ І.А.Кабановіч

31.08.2023

# СТАТУТ
навуковага таварыства
навучэнцаў «Квант»

## І. Агульныя палажэнні

Навуковае таварыства навучэнцаў Дзяржаўнай установы адукацыі «Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І.Слабодчыкава» (далей – таварыства) ствараецца загадам дырэктара з мэтай арганізацыі дадатковай працы з навучэнцамі, высокаматываванымі на вучобу.

Таварыства – гэта добраахвотнае, некамерцыйнае, навуковае, непалітычнае фарміраванне творчай моладзі, якая імкнецца ўдасканальваць свае веды ў галіне навукі, набываць уменні і навыкі навукова-даследчай дзейнасці пад кіраўніцтвам педагогаў і іншых спецыялістаў.

Таварыства з’яўляецца структурным падраздзяленнем установы адукацыі без стварэння юрыдычнай асобы.

Таварыства мае сваю назву, эмблему, дэвіз.

У сваёй дзейнасці кіруецца дадзеным Статутам, прынятым ва ўстаноўленым парадку, заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, нарматыўнымі, распарадчымі і інструктыўнымі дакументамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, упраўлення па адукацыі, спорце і турызме Вілейскага раённага выканаўчага камітэта.

Змены і дадаткі ў Статут таварыства ўносяцца ў парадку, устаноўленым дзеючым заканадаўствам.

## ІІ. Мэты і задачы таварыства

Мэтай дзейнасці таварыства з’яўляецца фарміраванне і развіццё сярод навучэнцаў Даўгінаўскай сярэдняй школы імя У.І.Слабодчыкава навыкаў даследчай дзейнасці.

Задачы таварыства:

фарміраванне інтарэсаў, схільнасцяў навучэнцаў да навукова-даследчай дзейнасці;

фарміраванне сістэмы навуковых поглядаў навучэнцаў;

развіццё пазнавальнай актыўнасці, інтэлектуальных і творчых здольнасцяў;

стварэнне ўмоў, якія спрыяюць павышэнню ўзроўня адукаванасці

навучэнцаў;
прапаганда навуковых ведаў сярод навучэнцаў і насельніцтва;
развіццё навыкаў публічных выступленняў.

III. Прынцыпы, змест і формы працы

Асноўнымі прынцыпамі працы таварыства з'яўляюцца:
добраахвотнасць удзелу ў рабоце таварыства;
ініцыятыўны ўнёсак у агульную справу;
творчы падыход да работы.

Змест работы таварыства вызначаецца рашэннем Агульнага сходу ў найболей актуальных напрамках тых ці іншых галін навукі і тэхнікі.

Таварыства арганізоўвае сваю дзейнасць у форме:
індывідуальнай навукова-даследчай, практычнай работы навучэнцаў пад кіраўніцтвам спецыялістаў на базе Дзяржаўнай установы адукацыі «Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І.Слабодчыкава»;
калектыўнай працы творчых груп навучэнцаў і творчай моладзі пад кіраўніцтвам спецыялістаў па вызначаных праблемах;
выязных навукова-даследчых экспедыцый, профільных лагераў;
навукова-практычных канферэнцый, злётаў і конкурсаў работ даследчага характару;
іншых формаў дзейнасці, не забароненых дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

IV. Членства ў таварыстве, правы і абавязкі членаў

Членамі таварыства з'яўляюцца:
навучэнцы Дзяржаўнай установы адукацыі «Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І.Слабодчыкава», якія выявілі жаданне працаваць у аб'яднанні і праяўляюць схільнасць і цікавасць да навуковай творчасці;
настаўнікі, іншыя асобы, якія прызнаюць Статут таварыства.

Члены таварыства абавязаны:
удзельнічаць у рабоце таварыства, конкурсах работ даследчага характару, самастойна паглыбляць веды ў выбранай галіне навукі;
выконваць патрабаванні дадзенага Статуту, выконваць рашэнні сходаў і кіраўнічых органаў;
актыўна садзейнічаць рэалізацыі мэт і задач таварыства, прапагандаваць дасягненні айчыннай навукі;
даваць справаздачу па выніках сваёй работы ў таварыстве.

Члены таварыства маюць права:
быць абранымі ў Савет таварыства;
прымаць удзел у рабоце адначасова некалькіх аддзяленняў;
уносіць прапановы па любых пытаннях дзейнасці, якая ажыццяўляецца таварыствам;
удзельнічаць у працы профільных летніх лагераў і экспедыцый;
удзельнічаць у конкурсах работ даследчага характару, злётах;
добраахвотна і беспераашкодна выйсці з членаў таварыства, а ў выпадку

прымусовага выключэння абскардзіць гэта рашэнне на Агульным сходзе;
за актыўную працу і дасягнутыя творчыя поспехі члены таварыства могуць быць прадстаўлены да ўзнагароджання граматамі, пасведчаннямі, пахвальнымі лістамі таварыства, грашовымі прэміямі і стыпендыямі, а таксама заахвочаны пуцёўкамі ў профільныя летнія лагеры, турыстычныя паездкі і г. д.

V. Структура і арганізацыя працы

Арганізацыйную структуру таварыства складаюць Агульны сход таварыства, Савет таварыства, аддзяленні.
Агульны Сход з’яўляецца вышэйшым органам кіравання таварыства. Агульны сход збіраецца адзін раз на год. На Агульным сходзе таварыства рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў і з’яўляюцца абавязковымі для выканання ўсімі членамі таварыства.
У перапынках паміж пасяджэннямі Агульнага сходу таварыства работай кіруе Савет таварыства, які збіраецца па меры неабходнасці, але не радзей за адзін раз у чвэрць.
Членамі Савета таварыства з’яўляюцца:
педагогі – куратары аддзяленняў;
навучэнцы – сакратары аддзяленняў.
Для курыравання работы таварыства з ліку педагогаў школы загадам дырэктара прызначаецца кіраўнік таварыства.
Кіраўнік таварыства аказвае дапамогу ў рабоце Агульнага сходу навучэнцаў, садзейнічае правядзенню пасяджэнняў Савета таварыства, удзельнічае ў пасяджэннях аддзяленняў.
На пасяджэннях аддзяленняў таварыства разглядаюцца тэмы даследчых праектаў, а таксама заслухоўваюцца справаздачы пра выніках работы членаў таварыства.

VI. Матэрыяльная база і фінансаванне

Памяшканні для работы таварыства прадстаўляюцца Дзяржаўнай установай адукацыі «Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І.Слабодчыкава», якая, па меры магчымасці, забяспечвае неабходным абсталяваннем, матэрыялам, інвентаром.
Работа аддзяленняў, Савета таварыства і Агульнага сходу ўлічваецца ў журнале, дзе ўказваюцца звесткі пра яго членаў, змест, рэжым працы. Журнал запаўняецца кіраўніком таварыства, які адказвае за яго захаванасць. Адначасова вядуцца пратаколы Агульнага сходу, Савета таварыства.
Фінансавае забеспячэнне таварыства ажыццяўляецца за кошт:
сродкаў мясцовага бюджэту, вылучаных на ўтрыманне адукацыі;
пазабюджэтных крыніц фінансавання;
паступленняў ад правядзення ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і ў адпаведнасці з мэтай таварыства, лекцый, майстар-класаў, навучальных семінараў і іншых мерапрыемстваў;
спонсарскай дапамогі юрыдычных і фізічных асобаў;

паступленняў за выкананне творчай прадукцыі ад арганізацый, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;
крэдытаў, атрыманых ва ўстаноўленым парадку;
паступлення ад выдавецкай і інфармацыйнай дзейнасці;
прыбыткаў ад іншай дзейнасці і з іншых крыніц, не забароненых дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
Вышэйпералічаныя сродкі паступаюць на разліковы рахунак арганізацыі-заснавальніка. Сродкі могуць выкарыстоўвацца толькі для ўмацавання і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы, павышэння якасці выкладання, матэрыяльнага заахвочвання спецыялістаў і членаў таварыства, стымулявання прагрэсіўных формаў навучання і выхавання, выканання статутнай мэты і задач таварыства.
Прыбыткі ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якія не супярэчаць дадзенаму Статуту, заканадаўству Рэспублікі Беларусь, павінны выкарыстоўвацца толькі для дасягнення статутных мэт і задач таварыства.

VII. Рэарганізацыя і ліквідацыя
Рэарганізацыя таварыства ажыццяўляецца па рашэнні Агульнага сходу таварыства, прынятаму не меней 2/3 галасоў яго членаў.
Таварыства можа быць ліквідавана:
па рашэнні кіраўніцтва арганізацыі-заснавальніка;
пры ліквідацыі арганізацыі-заснавальніка;
па рашэнні Агульнага сходу таварыства, прынятым не меней 2/3 галасоў яго членаў;
па рашэнні суда на падставе дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.